# МІНСК.

**19 мая 1956 года на імя Хрушчова паступіў дакумент, якому адразу прысвоілі грыф «Сакрэтна», хоць гэта быў праект выступлення Георгія Жукава на Пленуме ЦК КПСС, які павінен быў адбыцца. Але з чым была звязана такая канфідэнцыяльнасць, здавалася б, радавога даклада маршала, якіх на пленумах гучала нямала? Як сведчыць нядаўна рассакрэчаны тэкст, ён датычыўся аналізу памылак і пралікаў, дапушчаных у першыя гадзіны, дні вайны, і ніяк не ўпісваўся ў агульнапрынятыя ў СССР ацэнкі таго перыяду. Факты, якія там прыводзіліся, не проста непрыемныя — яны страшныя, асабліва тыя, што датычыліся сітуацыі ў Заходняй асобай ваеннай акрузе.**

## НЕБА ПАЧАРНЕЛА АД САМАЛЁТАЎ

У праекце выступлення гаварылася не толькі пра тое, што «...Узброеныя Сілы не былі своечасова прыведзены ў баявую гатоўнасць і да моманту ўдару саперніка ... ім не ставілася задача быць гатовымі адбіць удар, каб не справакаваць немцаў на вайну». Жукаў па хвілінах расказвае пра дзеянні кіраўніцтва 22 чэрвеня. «У 3 г. 15 хв. немцы пачалі баявыя дзеянні на ўсіх франтах. У 3 г. 25 хв. Сталін быў мною пабуджаны, і яму было даложана аб тым, што немцы пачалі вайну. ...Мы з тав. С. К. Цімашэнкам прасілі дазволу даць войскам загад аб адпаведных дзеяннях у адказ. Сталін, цяжка дыхаючы ў тэлефонную трубку, на працягу некалькіх хвілін нічога не мог сказаць, а на паўторныя пытанні адказаў: «Гэта правакацыя нямецкіх ваенных. Агню не адкрываць, каб не развязаць больш шырокіх дзеянняў». Як сведчыць дакумент, дазволу на дзеянні ў адказ войскам не давалі практычна да 6.30 раніцы 22 чэрвеня. Цана — вялізныя чалавечыя ахвяры ў войсках, сярод мірнага насельніцтва. Толькі авіяцыя Заходняй асобай ваеннай акругі фактычна была знішчана ў першыя гадзіны вайны — з 1200 самалётаў 22 чэрвеня над Беларуссю страчана 738, немцамі было атакавана 26 аэрадромаў (у Прыбалтыцы — 11), у памежжы гарэлі беларускія гарады і вёскі. Але ў Мінску ў першы дзень вайны сітуацыя была некалькі іншая. Гучныя заявы кіраўніцтва краіны аб непераможнасці Чырвонай Арміі, аб тым, што «ваяваць будзем на чужой тэрыторыі», рабілі сваю справу. Горад жыў звыклым жыццём, і ўсе былі ўпэўнены, што ворага вось-вось адгоняць за межы граніцы. Аптымізму дадавала і паведамленне ТАСС, апублікаванае ў друку 14 чэрвеня 1941 г., г. зн. за тыдзень да нападзення фашысцкай Германіі на Савецкі Саюз. У ім гаварылася: «...па даных СССР, Германія таксама няўхільна выконвае ўмовы савецка-германскага пакта аб ненападзенні, як і Савецкі Саюз, з прычыны чаго, на думку савецкіх колаў, чуткі аб намеры Германіі парваць пакт і распачаць нападзенне на СССР пазбаўлены ўсякай глебы».





Пратакол пасяджэння Бюро ЦК КП(б) Беларусі. 22.06.1941.

Упэўненасць, што ўсё хутка скончыцца і немцаў далей прыгранічных раёнаў не прапусцяць, была настолькі вялікая, што жыхары горада працягвалі жыць у звыклым рытме. Шмат народу прыйшло на ўрачыстае адкрыццё Камсамольскага возера: штучны вадаём стаў падзеяй для 300-тысячнага горада. Хтосьці збіраўся ў Дом афіцэраў на спектакль МХАТ імя Горкага, што гастраліравалі тады ў Мінску. Працавалі транспарт, рынак, крамы. І нават выступленне па радыё ў 12 гадзін дня Вячаслава Молатава, намесніка старшыні Саўнаркама, пра тое, што пачалася вайна, не выклікала асаблівай занепакоенасці. Немцы 22 чэрвеня горад не бамбілі. Не выклікалі панікі і першыя бамбардзіроўкі ваколіц Мінска раніцай 23 чэрвеня. (Некалькі нямецкіх знішчальнікаў, якія прарваліся, ажыццявілі налёты на чыгуначную таварную станцыю і аэрадром.) Людзі працягвалі верыць, што гэта выпадковасць, што ўсё хутка скончыцца. Але драма разгулялася зусім хутка, 24 чэрвеня. Горад бамбілі ўжо раніцай 24 чэрвеня, а дакладней, першы налёт 47 нямецкіх самалётаў ажыццявілі ў 9.40. Затым былі яшчэ тры налёты, масіраваныя бамбардзіроўкі запальнымі, фугаснымі бомбамі. Вялізныя разбурэнні, практычна адразу знішчаны цэнтр горада, пачаліся пажары, перастаў хадзіць транспарт, зачыняліся крамы, шмат параненых, забітых. Як успаміналі відавочцы, пасля чарговай бамбардзіроўкі Мінска ад вуліцы Валадарскага засталіся адны руіны, руіны засталіся і ад бальніцы, якая там знаходзілася. І страшная карціна: зачапіўшыся за перакрыццё трэцяга паверха разбуранага будынка, боўтаўся ложак, на якім на расцяжках лісеў загінулы пры налёце хворы. І такія карціны паўсюль, як і ні з чым не параўнальны пах пажарышча. Што датычыцца чыгуначных пуцей, то яны падвергліся бамбардзіроўцы ў першую чаргу і былі моцна разбураны, частка рухомага саставу знішчана, а Мінск працягвалі бамбіць і 24-га, і 25-га.



Аб бамбёжцы немцамі сталіцы сказана нямала, але незаслужана абыходзіцца



ўвагай іншы факт. Разбурэнняў магло быць значна больш, калі б не супрацьдзеянне савецкай авіяцыі. Нягледзячы на велізарныя страты, за Мінск біліся адчайна. Экіпажы ўзляталі з аэрадрома Балбасава, што недалёка ад Оршы, дзе базіравалася 43-я знішчальная авіядывізія пад камандаваннем генерал-маёра Георгія Захарава. Толькі адзін прыклад. Камдыў на сваім знішчальніку асабіста ацэньваў становішча над горадам. А яно было цяжкае. Гарэў не толькі Мінск, але і аэрадромы, на якіх знаходзілася незамаскіраваная тэхніка і самалёты. На гранічна нізкіх вышынях над горадам кружылі «юнкерсы», прыцэльна скідаючы бомбы на будынкі. Баі завязваліся прама над цэнтрам. Адзін такі паміж самалётам камдыва і чарговым «юнкерсам» адбыўся над дахам штаба Заходняй Асобай акругі. У выніку самалёт саперніка нахіліўся і ўпаў у раёне Опернага тэатра. Яшчэ адзін самалёт быў збіты над ускраінай горада. Сам жа камдыў садзіўся на пляцоўку ў Лошыцы, дзе таксама ўсё вакол гарэла. Рабілі, што маглі, каб адагнаць немцаў і мінімізаваць разбурэнні. Толькі лётчыкі аднаго 160-га палка дывізіі збілі больш за 20 нямецкіх самалётаў. «У небе было чорна ад фашысцкіх самалётаў, і якую б задачу мы ні ставілі лётчыкам, усё, па сутнасці, зводзілася да аднаго: збіваць! ...У тыя дні ні адной задачы — на штурмоўку, на прыкрыццё, на разведку — нельга было выканаць, не правёўшы паветранага бою. 24 чэрвеня 163-і полк збіў 21 варожы самалёт. Такую колькасць баявых машын нам не заўсёды ўдавалася збіваць на ват усёй дывізіяй у другую палову вайны», — так пазней успамінаў генерал арміі Захараў.







## ДАКУМЕНТЫ ПАД ГРЫФАМ «АСОБЫ СЕКТАР»

Можна толькі ўявіць, якой яшчэ драмай для Мінска маглі аказацца налёты нямецкай авіяцыі, калі б ім не супрацьстаялі савецкія асы. Кіраўніцтва рэспублікі знаходзілася ў Мінску, і, нягледзячы на тое, што Панцеляймон Панамарэнка, першы сакратар ЦК ВКП(б) Беларусі, быў членам ваеннага савета акругі і ведаў, што пачалася вайна, ужо з першых хвілін не пераставала верыць, што ўсё хутка скончыцца. Пастаянныя званкі, указанні з Крамля не паддавацца паніцы, не паддавацца на правакацыі таксама рабілі сваю справу. Пра тое, як дзейнічала беларускае кіраўніцтва, існуе нямала супярэчлівых даных. Нехта абвяляе, хтосьці вінаваціць яго ва ўцёках. Ісціна, як заўсёды, пасярэдзіне. А адказ — у дакументах, многія з якіх доўгія гады захоўваліся пад грыфам «Асобы сектар» — найвышэйшай ступені сакрэтнасці. Яны сведчаць, што элементы ўсіх гэтых з'яў прысутнічалі: быў і гераізм, і жаданне змяніць сітуацыю, як і дзеянні, якія не паддаюцца логіцы, маральным ацэнкам. Але факт застаецца фактам: у поўнамаштабную вайну ў першыя гадзіны і нават дні сапраўды верылася з цяжкасцю, таму ўсе дзеянні беларускага кіраўніцтва былі накіраваны не на эвакуацыю, а на аднаўленне Мінска пасля бамбёжак, забеспячэнне нармальнага функцыянавання горада: сувязь, водазабеспячэнне, работа прадпрыемстваў.

Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь, фонд 4, вопіс 33 а, справа 4. Тут захоўваецца рассакрэчаны «Дзённік работы ЦК КП(б) Беларусі». Пачата 22 чэрвеня 1941 года, скончана 19 жніўня 1941 года». У ім літаральна па гадзінах распісаны ўсе зробленыя беларускім кіраўніцтвам крокі. Фактычна да дзвюх гадзін ночы 25 чэрвеня, да таго часу, пакуль улада заставалася ў Мінску, акцэнт рабіўся на аднаўленчыя работы. Пункт 1 запісу ад 24 чэрвеня 1941 года абвяшчаў: «Прыняты меры па ліквідацыі наступстваў бамбардзіроўкі, адноўлены тэл. сувязь, водаправод у гор. Мінску». З 22 да 25 чэрвеня ажыццяўлялася эвакуацыя сакрэтных архіваў, дакументаў ЦК партыі і камсамола, дзяржбанка з усімі каштоўнасцямі і архівам, дзіцячых устаноў». Толькі 23 чэрвеня дадзены ўказанні аб падрыхтоўцы да эвакуацыі наркаматаў, прадпрыемстваў, абсталявання, трактароў, жывёлы. Часткова эвакуацыя пачалася ўжо 22 чэрвеня, але масавай яшчэ не было, ды і падрыхтаваць да адпраўкі абсталяванне толькі 332 прамысловых прадпрыемстваў за дзень — два нават у стабільны мірны час — задача архіскладаная, а гаворка ішла пра нявызначанасць сітуацыі: 24 чэрвеня ўсё яшчэ даваліся ўказанні «па падтрыманні парадку ў гор. Мінску пасля бамбардзіроўкі».

Эвакуацыя ў Мінску і эвакуацыя ў іншых гарадах — гэта зусім не раўназначныя працэсы. У іншых гарадах